# З ДНЁМ ПЕРАМОГІ, ТАВАРЫШЫ!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 17 (640) Пятніца, 6 мая 1966 года Год выдання XIX. Цана 1 кап.

## У ПЕРШЫЯ ДНІ ВАЙНЫ

22 чэрвеня 1941 года пачалася Вялікая Айчынная вайна. А шостай гадзіне гэтага дня ў нашым універсітэце назначаўся ўрачысты вечар па святкаванню дваццаццігоддзя з дня нараджэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У гэты ж час намячалася адкрыць юбілейную выстаўку, прысвечаную дасягненням універсітэта за ўсе дваццаць год. Выстаўка да 21 чэрвеня ў асноўным была падрыхтавана. Але правесці назначаныя ўрачыстасці не ўдалося. Універсітэт аказаўся ў ліку першых аб'ектаў, на якія абрушыліся бомбы фашысцкіх выродкаў.

У першыя ж дні вайны 450 выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта з'явіліся на прызыўныя пункты, каб стаць у шарэнгі Савецкай Арміі.

Не знаходзіліся ў Мінску групы гістарычнага і біялагічнага факультэтаў. Яны праходзілі вытворчую практыку (студэнты гістарычнага факультэта працавалі на археалагічных раскопках у Крыму, а біёлагі былі ў Белавежскай пушчы). Многія з іх з'явіліся на прызыўныя пункты па месцы свайго знаходжання і ўступілі ў рады Савецкай Арміі.



Сімвалам мужнасці і непераможнасці савецкага народа ўзвышаецца ў родным Мінску абеліск Перамогі.

## ІХ ІМЁНАЎ НЕ ЗАБУДЗЕМ

Дзейнасць групы Е. М. Зубковіча, А. В. Вязовіча і З. Завістовіча была звязана з партызанскім рухам Мінскай вобласці. Важную ролю ў кіраўніцтве гэтай групай адыгрываў Е. М. Зубковіч. Акрамя гэтага, ў яго была цесная сувязь з Мінскім падполлем. Вось што расказвае жонка А. В. Вязовіча аб дзейнасці гэтых барацьбітоў:

— Група выкладчыкаў універсітэта сабірала звесткі аб размяшчэнні нямецкіх часцей у горадзе, дапамагала савецкім грамадзянам ісці ў партызанскія атрады.

Па словах А. К. Цітка, Е. М. Зубковіч меў сярод нямецкіх афіцэраў шмат знаёмых, якія без ніякай падазронасці расказвалі яму аб месцазнаходжанні ваенных атрадаў. Атрыманыя такім чынам звесткі перадаваліся сувязной, якая дастаўляла іх партызанам. Па даручэнню Мінскага падпольнага цэнтра члены групы вывелі з Мінска многа савецкіх грамадзян ў партызанскія атрады. Зімой 1944 года фашысты арыштавалі Е. М. Зубковіча і пратрымалі больш двух месяцаў у турме, але мужны патрыёт не выдаў таварышаў. Немцы, нічога ад яго не дабіўшыся, выпусцілі з турмы. Дваццаць шостага чэрвеня ў дом, дзе жыў А. В. Вязовіч, уварвалася група фашыстаў і арыштавала яго. У гэты ж дзень быў арыштаваны і Е. М. Зубковіч. За некалькі дзён да вызвалення горада ад гітлераўцаў дацэнт Е. М. Зубковіч, асістэнт А. В. Вязовіч і аспірантка З. Завістовіч былі расстраляны фашысцкімі катамі.

## МУЖНАЯ КАМСАМОЛКА

*У Мінскім музеі Вялікай Айчыннай вайны беражліва захоўваецца камсамольскі білет студэнткі другога курса геаграфічнага факультэта Ніны Абрамавай. Разам з ім у музеі захоўваюцца і матэрыялы, якія расказваюць аб слаўнай дзейнасці камсамолкі ў гады вайны.*

*Яна з'яўляецца выдатніцай вучобы, прымала актыўны ўдзел ў грамадскім жыцці факультэта і універсітэта. Калі фашысцкія выродкі захапілі нашу рэспубліку, Ніна Абрамава разам са сваёй маці знаходзілася ў Мінску. І з першых дзён становіцца ў рады барацьбітоў. Праз некаторы час яна сабрала студэнтаў геаграфічнага факультэта і прапанавала ім пачаць падрыўную дзейнасць супраць ненавіснага ворага.*

*Ёй і яе групе ўдалося ўладкавацца на працу на нафтабазу. Тут Ніна і яе сяброўкі рабілі ўсё магчымае, каб шкодзіць фашыстам. Ніна мела сувязі з іншымі падпольшчыкамі і партызанамі. Ад кіраўніцтва падполля яна атрымлівала важныя заданні і заўсёды выконвала. У 1943 годзе фашысты натрапілі на след падпольшчыцы. Ніну даставілі ў гестапа. Фашысты хацелі, каб Ніна назвала прозвішчы іншых падпольшчыкаў і расказала аб месцазнаходжанні партызанскага атрада. Але патрыётка мужна вытрымала ўсе выпрабаванні. Яна была замучана ў Асвенціме.*

**Г. ЯНОВІЧ.**

## БАЯВЫЯ СТАРОНКІ ГІСТФАКА

Побач пажоўклы ад часу нумар франтавой газеты «Звязда Саветаў» У адной з заметак яе расказваецца пра баявую дзейнасць выпускніка гістарычнага факультэта нашага універсітэта Кірыла Конанавіча Германа: «Па вузкім шчылінам траншэй, ад адной гарматы да другой прабіраецца парторг батарэі — гвардыі старшыня Герман. Ён гутарыць з байцамі, чытае ва ўсіх аддзяленнях зварот Ваеннага Савета. На світанні грымнуў бой. У першай жа бойцы з гітлераўцамі паказаў сябе гарматны разлік гвардыі старшага сяржанта Голікава. Ён падбіў чатыры танкі ворага і знішчыў восемдзесят гітлераўцаў. Зараз жа парторг напісаў пра гэты бой заметку ў газету пад назвай «Змагайся, як яны!»

Кірыл Конанавіч Герман — выхаванец гістарычнага факультэта. Мы ганарымся яго баявой дзейнасцю. Побач з яго прозвішчам можна назваць шмат студэнтаў, выкладчыкаў гісторыка Пятра Захаравіча Савачкіна—дэкана факультэта, Сяргея Герасімавіча Скапцова, Рыгора Маркавіча Трухнова, Аляксея Ісаевіча Сідарэнку і іншыя.

Многія студэнты і выкладчыкі факультэта не вярнуліся з вайны. Яна геранчна загінулі ў баях. За актыўную падпольную дзейнасць у мястэчку Беразіно ў 1942 годзе фашысты павесілі студэнта гістфака Фёдара Глінскага. Перад смерцю Фёдар крыкнуў: «Усіх не перавешаеце! За намі праўда, перамога!». Справу Фёдара працягвала яго жонка Вера Віткоўская, якая загінула ад рук гестапаўцаў у 1944 годзе за некалькі дзён да прыходу ў Беларусь Савецкай Арміі.

У гады вайны сталі дэсантнікамі - добраахвотнікамі Афанасій Налівайка і Мікалай Бабчынскі. Абое яны геранчна загінулі ў баях за вызваленне роднага краю. Слаўны баявы шлях прайшоў член камітэта камсамола універсітэта Леанід Сокал. Аб тым, як старанна ён вучыўся, сведчыць тое, што Леанід атрымліваў стыпендыю імя XX-годдзя камсамола. Геранчна загінуў Сокал у баях пад Мажайскам, у час танкавай атакі ворага. Многія студэнты гістфака з'яўляліся ўдзельнікамі партызанскага руху на Беларусі. Сярод іх: Вадзім Пазняк, Павел Астапенка, Цярэнцій Арцюшковіч, Герасім Емельянаў, Надзя Вінакурава, Аляксандр Крышчановіч і многія іншыя.

Мы ніколі не забудзем іх мужнасці, праяўленай у баях за вызваленне нашай радзімы.

**Я. БАРАНОЎСКІ,**
**студэнт 5-га курса гістарычнага факультэта.**

## ТАК ЗАКОНЧЫЛАСЯ ВАЙНА

Ішоў чацвёрты год вайны. Фашысты адступалі пад магутнымі ўдарамі савецкіх войск. Усё шчыльней скоўвалася вакол логава ворага сталёвае кола. Савецкія воіны вялі апошнія баі. Бліскучай перамогай закончылася берлінская бітва. Над рэйхстагам горда ўзвіўся чырвоны сцяг.

А баі яшчэ не адгрымелі. І нашы воіны рыхтаваліся да новых бітваў. Кожны з іх зразумеў, што перамога блізка і што трэба зрабіць апошні магутны ўдар, каб зламаць шалёнае супраціўленне гітлераўцаў, якія ўсё яшчэ вялі баі ў Чэхаславакіі. Выконваючы свой інтэрнацыянальны абавязак, камандаванне 1-га Украінскага фронту аддало загад войскам, у тым ліку і танкавай арміі, у састаў якой уваходзіла наша механізаваная брыгада і танкавы полк, прыняць удзел у вызваленні братняй Чэхаславакіі і яе сталіцы.

Шлях ад Берліна да Прагі перавышаў 600 кіламетраў. 8 мая нашы «Т-34» імклівай лавінай рушылі на дапамогу чэхам. 9 мая калона танкаў дасягнула горада Лоўні. А на світанні мы падыйшлі да Прагі. На вуліцах чэшскай сталіцы ішлі цяжкія барыкадныя баі, і наш падыход быў своечасовым. Пад магутнымі ўдарамі танкаў разляцелася кальцо фашысцкага акружэння. Гітлераўскія падраздзяленні адно за адным здаваліся ў палон. Абаронцы горада расчысцілі ад барыкад шлях для нас, усюды нам наладжваліся ўрачыстыя сустрэчы.

У сем гадзін вечара ў пасёлку Спаражылава на ўскраіне Прагі мы пачулі па радыё хвалюючую вестку аб капітуляцыі фашысцкай Германіі. Гэта быў даўгачаканы дзень Перамогі. Нашай радасці не было канца. Памятаю, у тыя хвіліны да майго танка падыйшоў жыхар пасёлка Юрый Урбанек з трыма дзецьмі і папрасіў у нас сфатаграфавацца разам з імі каля танка.

Вайна закончылася, але раптам 9 мая мы атрымалі загад арганізаваць абарону і знаходзіцца ў стане баявой гатоўнасці.

Раніцай 10 мая камандзір танкавага палка падпалкоўнік Жураўлёў загадаў мне ўзначаліць баявы атрад і рухацца ў напрамку горада Бенешаў. Аб праціўніку ў нас не было ніякіх звестак. У якасці баявога дазору нашай калоне быў выдзелены танк Героя Савецкага Саюза гвардыі лейтэнанта Саенкі.

Неўзабаве калона наблізілася да бурлівай горнай рэчкі Сазава. І тут наш рух на імгненне замарудзіўся. Камандзіры сабраліся, каб параіцца, як пераадолець пешаходны мост праз раку. Мы думалі, што фашысты замініравалі яго. Было вырашана, што першым цераз мост пойдзе дазорны танк.

Раптам з супроцьлеглага берагу Сазавы на мосце насустрач нам паказаўся высокі мужчына. Ён сказаў, што чэшскія партызаны знішчылі засаду фашыстаў, што небяспекі для савецкіх салдат не існуе. Цяпер прыходзіцца шкадаваць, што не запытаўся пра прозвішча гэтага чэшскага патрыёта. А даведацца, хто ён такі, вельмі хацелася б.

Наш баявы атрад уступіў у Бенешаў, заняў вакзал. На працягу 11—12 мая гітлераўцы вялікімі групамі здаваліся ў палон. Так заканчвалася вайна. Праз некалькі месяцаў капітулявала і імперыялістычная Японія. Усталяваўся даўгачаканы мір.

**А. А. ФІЛІМОНАЎ,**
**Герой Савецкага Саюза, капітан запасу, кандыдат гістарычных навук.**

## МУЗЕЙ БЫЎ УРАТАВАНЫ

У захопленым Мінску аказалася вялікая група студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта. Калі ў памяшканні біялагічнага факультэта пачаў размяшчацца нямецкі ваенны шпіталь, яны прыклалі шмат старання для ўратавання універсітэцкай маёмасці. Фашысты выкінулі на вуліцу экспанаты заалагічнага музея, поўнасцю абрабавалі бібліятэку. З вялікай цяжкасцю дацэнту Е. М. Зубковічу, асістэнту А. В. Вязовічу ўдалося перавезці заалагічны музей на Віцебскую вуліцу ў будынак цяперашняга абласнога Інстытута ўдасканалення настаўнікаў. Сюды ж была перанесена частка абсталявання хімічнага і некаторыя наглядныя дапаможнікі геаграфічнага факультэтаў. За зберажэннем гэтай каштоўнай маёмасці сачыў А. К. Цітоk, які ў цяжкія ваенныя гады зрабіў усё магчымае, каб даверанае яму навуковае багацце засталося цэлым.

**П. КЛІМАВЕЦ.**

# БДУ НА СТАНЦЫІ СХОДНЯ

Ва ўмовах ваеннага часу партыя і ўрад паклапаціліся аб аднаўленні работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта на станцыі Сходня Кастрычніцкай чыгуначнай дарогі. Універсітэту пад вучэбную плошчу быў перададзены будынак школы, а таксама сорак дач для размяшчэння прафесарска-выкладчыцкага калектыву і студэнтаў.

Вестка аб адкрыцці Беларускага універсітэта хутка абляцела краіну. Неўзабаве на станцыю Сходня пачалі прыбываць і першыя навучэнцы. Прыязджалі студэнты, якія прайшлі суровую школу барацьбы з гітлераўскімі захопнікамі на франтах, у партызанскіх атрадах, у падполлі і дэмабілізаваныя па раненню. Частку студэнцтва складала моладзь, якая ў час вайны закончыла сярэднюю школу. Сіламі выкладчыкаў і студэнтаў адведзены для навучання будынак быў прыстасаваны для вучобы і жылля.

1 кастрычніка 1943 года на факультэтах універсітэта навучалася ўжо каля 300 студэнтаў.

Вялікую дапамогу нашаму універсітэту аказаў МДУ. На станцыі Сходня нехапала памяшканняў і навуковага абсталявання. Рэктарат МДУ прадставіў для нашых студэнтаў свае аўдыторыі і лабараторыі. Заняткі першага і другога курсаў біялагічнага факультэта ў асноўным праходзілі ў МДУ. Маскоўскі універсітэт таксама перадаў бібліятэцы БДУ звыш 18 тысяч кніг па самых розных галінах навукі.

Заняткі праходзілі ў выключна цяжкіх умовах. Адна з аўдыторый у вячэрні час адводзілася пад чытальную залу, а ноччу пад начлег. У канцылярыях і бібліятэках працавалі студэнты. Усюды было ўведзена самаабслугоўванне. Студэнтам прыходзілася выконваць шмат неабходных работ па гаспадарцы. Запявваламі ўсіх добрых спраў былі камсамольская і прафсаюзная арганізацыі.

У сэрцы кожнага юнака адчувалася вялікая прага да навукі, старанне стаць высокакваліфікаваным спецыялістам. Рэгулярна выходзіла насценная газета. У склад рэдкалегіі ўваходзіў студэнт 4-га курса філфака Іван Мележ. Цікава праходзілі камсамольскія сходы і вечары адпачынку, арганізоўваліся культпаходы ў тэатры і кіно.

Летам 1944 года гітлераўскія захопнікі былі выгнаны з тэрыторыі нашай рэспублікі. 11 жніўня ў Мінск прыехала першая група студэнтаў. Галоўныя вучэбныя карпусы — біялагічны і хімічны — былі спаленымі. Адзіным не разбураным будынкам застаўся невялікі корпус фізіка-матэматычных навук, які і стаў цэнтрам універсітэта.

Перад выкладчыкамі і студэнтамі стаяла адказная задача. у самы кароткі час падрыхтавацца да першага пасля эвакуацыі навучальнага года. Студэнты і выкладчыкі адрамантавалі будынак фізіка-матэматычнага корпуса і будынкі некаторых інтэрнатаў. За актыўны ўдзел у аднаўленні БДУ многія студэнты і выкладчыкі былі ўзнагароджаны медалямі «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.»

1 Кастрычніка 1944 года ў Мінску ва універсітэце пачаліся заняткі.

В. К. ГАРАВЕЦ,
дацэнт.

# «АПТЭЧНАЯ ГРУПА»

**У Мінску ў час вайны было вельмі многа явачных кватэр. Адна з іх знаходзілася на вуліцы Савецкай № 6, у памяшканні аптэкі, загадчыкам якой быў студэнт хімфака нашага універсітэта Георгій Фалевіч. Ён узначаліў групу камсамольцаў. Дзеяннямі яе кіраваў член Мінскага падпольнага камітэта КП Беларусі Уладзімір Сцяпанавіч Амельянюк, адзін з першых арганізатараў партыйнага падполля ў Мінску. Задачай «Аптэчнай групы» Георгія Фалевіча з'яўлялася забеспячэнне падпольшчыкаў і партызан медыкаментамі. Раніцай 26 мая 1942 года ў аптэцы Георгія Фалевіча здарыліся трагічныя падзеі. У аптэку прыйшлі дзве дзяўчыны-сувязныя Жэня і Оля. Ля касы сядзела, як заўсёды, Ніна Яфіменка, сябра і баявы памочнік Георгія. Дзяўчаты падыйшлі да яе і пачалі гаворку пра нейкія хваробы. У гэты час Оля прыкрыла сабой касу, а Ніна асцярожна перадала сетку са шрыфтамі. Шрыфты рыхтаваліся для адпраўкі ў партызанскі атрад, каб наладзіць там друкаванне газет. Дзяўчаты пастаялі і пайшлі...**

**Нечакана зайшоў пабялеўшы Георгій. Праходзячы міма касы, ён сказаў Ніне: «Зайдзі да мяне». Пасля ён паведаміў: «Толькі што на вуліцы забіты Уладзімір Сцяпанавіч...»**

**У аптэцы было ціха. Ніна чула, як нешта перастаўляў у сваім кабінеце Георг. Раптам нейкая цень упала на яе твар. Ніна ўздрыгнула і падняла галаву. Перад ёй стаялі Жэня, Оля і побач незнаёмы ў чорных акулярах. Твары дзяўчат былі сумнымі, устрывожанымі. Жэня трымала сетку, тую ж самую сетку, у якой ляжалі шрыфты. У аптэку ўвалілася група больш за дзесяць чалавек. Яны гаварылі паміж сабой на незнаёмай мове.**

**— Ні з месца!**

**Усе зразумелі, што гэта СД. Праз некаторы час арыштаваных Георгія, Н.ну, Дзмітрыя—вартаўніка аптэкі адправілі ў турму. Яны былі закатаваны фашыстамі.**

**І. СЯМЁНАЎ.**

# УСПАМІНАЮЧЫ БЫЛОЕ...

Іосіф Васільевіч Зазека, дацэнт кафедры рускай літаратуры філалагічнага факультэта, працаваў намеснікам дырэктара педагагічнага інстытута ў горадзе Беластоку. Тут і напаткала яго вайна. З фашысцкай навалай нельга было прымірыцца. Змагацца, змагацца ў любых умовах — такое было рашэнне Іосіфа Васільевіча.

Да ухода ў партызаны быў падпольшчыкам. Шмат перадаў інфармацый аб месцазнаходжанні варожых ваенных аб'ектаў, аб праходжанні цягнікоў, аб манеўрах ваенных часцей.

Летам 1942 года па рашэнню Брэсцкага падпольнага антыфашысцкага камітэта Зазеку накіравалі ў партызаны, у брыгаду імя Чапаева. Спачатку быў разведчыкам, а пасля рэдактарам партызанскай газеты «Свіслацкая праўда». Галоўную ўвагу газета ўдзяляла баявой дзейнасці партызан. Але хіба можна было забыцца пра партызанскую лірыку. Паступіла шмат просьб аб выданні асобнага зборніка партызанскіх песень. У выключна цяжкіх умовах Іосіф Васільевіч пачаў працу над выданнем. Было сабрана шмат песень, частушак. На вокладцы зборніка чырвонымі літарамі было выведзена: «Песні і частушкі аб Вялікай Айчыннай вайне». Тыраж — 200 экземпляраў.

Пасля выхаду зборніка з розных атрадаў прыбывалі партызаны з просьбай выдаць для атрада хоць адзін песеннік. Шмат вершаў было тут і самога рэдактара.

Адгрымелі залпы вайны. Іосіф Васільевіч зноў вярнуўся ў студэнцкія аўдыторыі. Але пра вайну не забыўся. Мы часта чытаем яго нарысы, апавяданні пра барацьбу беларускага народа супраць фашыстаў. А неўзабаве ў выдавецтве «Беларусь» выйдзе кніжка апавяданняў І. В. Зазекі «Лясныя сябры».

С. МЕЛЬНІКАВА.

# КАЛІ ПАКЛІКАЛА РАДЗІМА...

*Хто б мог падумаць, што з гэтага чарнявага хлапчука, які тым і вылзяляўся сярод сваіх аднагодкаў, што быў меншым за іх, выйдзе ў будучым беларускі вучоны — фізік. Была ў хлапчука мара, вабілі яго дзіцячае сэрца далёкія падарожжы. Але паванэраваць яму так і не ўдалося. Бяда прыйшла нечакана. У сем год страціў бацьку. Для сям'і, якая налічвала восем чалавек, страта кармільца раўназначна смерці. Напаткала няшчасце маці — яна страціла рукі ў час аварыі на лесапільні. Здарылася б гэта ў дакастрычніцкі час— кожнага чакаў бы трагічны лёс. Але Савецкая ўлада дазволіла атрымаць дзецям адукацыю, знайсці свае месца ў жыцці. Самы малодшы Іван ужо скончыў восем класаў. Чорнай хмарай над гарадамі і вёскамі навісла вайна. Пятнаццацігадовы юнак марыць пайсці на фронт. Але фронт далёка. Ходзяць чуткі, што недзе блізка партызаны, але як з імі сустрэцца.*

*І ўсе-такі сустрэча адбылася. Партызаны, даведаўшыся, што фашысты рыхтуюць супраць іх вялікую карную экспедыцыю, забралі з навакольных вёсак усіх людзей да сябе ў атрад. Іван трапіў у атрад да Генадзя Каралёва. Тут, у час блакады, юнак атрымаў першае баявое хрышчэнне. Пасля некалькіх удалых аперацый немцы парашылі знішчыць атрад «лясных салдат». Яны не маглі даравацъ партызанам разбітую пераправу праз раку Сож. Адступаючы, фашысты пабудавалі пантонную пераправу. Даведаўшыся аб гэтым, партызаны сярод белага дня абстралялі яе з адзінай сваёй гарматы. Такой смелай выхадкі мсціўцаў немцы не чакалі. У той дзень некалькі варожых батальёнаў блакіравалі партызанскі атрад у прысожскіх балотах. А ў наступную ноч на шашы падарвалася некалькі варожых аўтамашын. Сярод тых, хто хадзіў на шашу, быў і Іван Зяцькоў. А пасля — злучэнне з часцямі Савецкай Арміі, палкавая школа, званне малодшага камандзіра.*

*1943 год. Румынія. Батальён асобага назначэння Паўднёвай групы войск атрымаў загад любымі сродкамі не даць магчымасці ўзарваць немцамі мост праз раку Дунай. Намеснік камандзіра ўзвода старшы сяржант Іван Зяцькоў з кулямётным разлікам заняў абарону на самых подступах да маста. Адкінуты ў час бою на той бок ракі, вораг шалёна агрызаўся. Усе атакі, якія немцы рабілі, каб зноў захапіць мост, цярпелі няўдачу. І толькі калі нашы часці пайшлі ў наступленне, байцы пакінулі плацдарм. За гэтую аперацыю батальён быў узнагароджаны ордэнам «Чырвонага Сцяга». А байцы, у тым ліку і Іван Паўлавіч Зяцькоў, атрымалі ўрадавыя ўзнагароды. На самых адказных участках даводзілася ваяваць батальёну, і ўсюды яго салдаты выходзілі пераможцамі. Так яны дайшлі да Вены, дзе і сустрэў перамогу старшына стралковай роты Іван Зяцькоў.*

*— Дэмабілізаваўся толькі ў 1950 годзе, — расказвае Іван Паўлавіч. Трэба было працаваць, і я пайшоў у органы юстыцыі. Папрацаваў крыху і зразумеў, што трэба вучыцца, бо той адукацыі, якую я меў, было недастаткова. Сеў за парту. А праз два гады з сярэбраным медалем скончыў школу працоўнай моладзі.*

*Добрыя веды і жыццёвы вопыт адкрылі дарогу ва універсітэт, пасля заканчэння якога паступіў у аспірантуру. У 1963 годзе абараніў дысертацыю і атрымаў навуковую ступень кандыдата фізічных навук.*

*Працуючы дэканам фізічнага факультэта, Іван Паўлавіч Зяцькоў усе сілы аддае высакароднай справе вучонага, педагога, камуніста.*

*А. ЯРОХІН.*

# ЯНЫ Ў БАЯХ ЗАВАЯВАЛІ СЛАВУ



У гады Вялікай Айчыннай вайны на абарону Радзімы пайшлі многія студэнты і выкладчыкі хімфака.

І. Г. Цішчанка зараз з'яўляецца загадчыкам кафедры арганічнай хіміі. Доўгі час ён быў дэканам факультэта. А ў гады вайны мужна змагаўся на фронце.

В. Б. Беляеў амаль усю вайну правёў у баях. Змагаўся за вызваленне Беларусі. А цяпер з'яўляецца загадчыкам кафедры агульнай хіміі. Хімфакаўцы ведаюць яго, як выдатнага педагога, таленавітага вучонага.

Шмат гітлераўскіх акупантаў і эшалонаў падарвалася на партызанскіх мінах, падкладзеных Н. А. Поляк, В. Р. Скараход і А. Р. Улазавай. Цяпер яны дацэнты факультэта. Шмат старання і педагагічнага майстэрства аддаюць гэтыя вучоныя для выхавання высокакваліфікаваных спецыялістаў. Прафесары М. М. Паўлючэнка і Н. Ф. Ярмоленка многа сіл прыклалі ў гады вайны для развіцця абароннай магутнасці Савецкай Арміі.

Вось далёка няпоўны пералік тых, хімікаў нашага універсітэта, хто сваёй мужнасцю каваў перамогу над фашысцкай чумой. І было б вельмі добра, каб камсамольцы нашага факультэта напісалі рукапісную кніжку пра хімфакаўцаў—удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

**Рэдкалегія газеты «Хімік».**

**НА ЗДЫМКУ: Студэнты хімфака нашага ўніверсітэта 1940—41 года навучання, якія ў першыя гады вайны пайшлі на фронт. Злева направа (сядзяць) А. Х. Клецкін, В. Ф. Бяляеў, Ф. І. Аўрамчыкаў, (стаяць) І. С. Старобінец, Б. Мядвінскі, П. Х. Самафалаў.**

# У АТРАДЗЕ «ПОЛЫМЯ»

Гэтыя мясціны вабяць сваёй прыгажосцю. Калі падняцца на ўзгорак, то можна далёка-далёка бачыць срэбную стужку Талькіракі, сасновы бор на яе правым беразе, а на левым—палі, пакрытыя аксамітам маладой зеляніны. На світанні, калі кроплі расы звісаюць з лістоў, у ціхай завадзі Талькі плешчуцца шчупакі і ляшчы... Словам, нездарма сюды тад часта наведваюцца універсітэцкія турысты.

Вось сярод гэтай маляўнічай прыроды праходзіла баявое юнацтва Івана Іванавіча Пятроўскага.

Якраз у 1941 годзе Ваня Пятроўскі скончыў сярэднюю школу. Здольны юнак хацеў стаць фізікам і таму адаслаў заяву ў Мінск ва універсітэт з просьбай прыняць на фізмат. Але адказ не паспеў прыйсці. Пачалася вайна. А неўзабаве ў пасёлку Талька ўжо былі гітлераўцы. Яны прынеслі пакуты, кроў і слёзы на родную зямлю. Гнеў і абурэнне ўздымалася ў беларускім народзе. Пакляўся помсціць ворагу да апошняга дыхання, да апошняй кроплі крыві і 16-гадовы Ваня Пятроўскі.

І вось у пасёлку Талька ўзнікла падпольная камсамольская арганізацыя, сакратаром якой быў абраны Ваня Пятроўскі. Спачатку арганізацыя налічвала ў сваіх радах усяго толькі сем чалавек, але з цягам часу расла і мацнела. А ў лістападзе 1941 года талькаўскім камсамольцам удалося наладзіць сувязь з партызанамі, і з гэтага часу яны пачалі выконваць заданні народных мсціўцаў. Над ціхай рэчкай Талькай загучэлі выбухі, запалалі пажары. Камсамольцы выкрадвалі ў ворага зброю і перапраўлялі яе ў лес да партызан. Такім чынам партызаны атрымалі ад падпольшчыкаў каля 30 аўтаматаў і вінтовак, два ручных кулямёты, вялікую колькасць баяпрыпасаў.

Лета 1942 года стала трагічным для камсамольцаў Талькі. Фашысты нейкім чынам раскрылі падпольную арганізацыю і большасць яе членаў загінула. Толькі цудам удалося Ваню і некаторым яго таварышам пазбегнуць лап карнікаў. Але заставацца ў пасёлку больш было немагчыма, і таму ён пайшоў у партызанскі атрад. Атрад называўся «Полымя». Полымя помсты шумела ў сэрцах партызан.

Ваня Пятроўскі ў дасканаласці авалодаў падрыўной справай. Яго аддзяленне, а пазней узвод падарваў 12 эшалонаў, 2 чыгуначныя масты, 5 аўтамашын—такі кароткі пералік баявых спраў Вані Пятроўскага і яго сяброў. За гэтымі кароткімі лічбамі крыецца і рызыка, і жорсткія баі, і доўгія гадзіны цярплівага чакання ў засадах пад праліўным асеннім дажджом ці ў траскучы мароз.

Надыйшоў доўгачаканы час, калі фашысты былі прагнаны з роднай зямлі. І Ваня Пятроўскі, на грудзях якога красаваліся ордэны Баявога Чырвонага Сцягу і Чырвонай Звязды, пераступіў парог універсітэта.

Пачала ажыццяўляцца яго даваенная мара стаць фізікам...

Зараз дацэнт Іван Іванавіч Пятроўскі адзін з самых паважаных выкладчыкаў на факультэце. Ён чытае лекцыі, вядзе вялікую навуковую работу. Не так даўно ім была напісана кніга «Уводзіны ў тэорыю паўправаднікоў», якая стала вельмі карысным дапаможнікам для студэнтаў радыёфізікаў. Актыўны ўдзел прымае Іван Іванавіч у грамадскім жыцці універсітэта.

Цёплай вясенняй ноччу гучыць песня над хвалямі Талькі. Між соснамі бялеюць палаткі турыстаў. Задумёныя юнакі і дзяўчаты сядзяць вакол вогнішча, і нехта з іх гаворыць:

— А ведаеце, хлопцы, тут жа ваяваў наш Іван Іванавіч.

В. ГРАКАЎ.

Рэдактар А. ЛОЙКА.

АТ 01679 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. № 640.